І.Н. Колабава (Мінск)

# ДА ПЫТАННЯ ФАЛЬШЭРСТВА ГРОШАЙ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ XIX ст.

Матэрыялы фонда канцылярыі віцебскага грамадзянскага губернатара (ф. 1430) з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ўтрымліваюць значную колькасць спраў з інфармацыяй аб абарачэнні ў рэгіёне фальшывых манет і папяровых грошай (асігнацый і крэдытных білетаў).

У фондзе пры агульнай колькасці спраў у межах 55 тыс. адзінак захоўвання, 118 утрымліваюць звесткі аб дзейнасці фальшываманетчыкаў (14 з іх датычаць падробкі манет, а ў 105 гаворка ідзе аб фабрыкацыі папяровых грошай). З гэтага можна зрабіць выснову аб тым, што найбольшай папулярнасцю сярод фальшываманетчыкаў карысталася менавіта падробка папяровых грошай. Вывучэнне матэрыялаў гэтага фонда дае магчымасць побач з іншым адсачыць ход следства па дзейнасці і пошуку фальсіфікатараў.

Разглядаемыя ніжэй справы фонда даюць магчымасць скласці своеасаблівую мазаіку, якая характарызуе працэс функцыянавання на тэрыторыі Віцебскай губерні фальшывых грошай.

Трэба адзначыць, што пасля сканчэння вайны 1812 года на руках у насельніцтва акрамя падробных расійскіх асігнацый мясцовага паходжання апынулася і значная колькасць фальсіфікатаў аналагічных купюр французскай вытворчасці [2]. Сведчыць аб гэтым і фонд канцылярыі віцебскага грамадзянскага губернатара. Так, у шэрагу спраў адзначаюцца факты выяўлення французскіх падробак і парадак дзеянняў улад у падобных выпадках.

23 студзеня 1814 года праўленне дзяржаўнага заёмнага банка паведамляе віцебскаму губернатару аб тым, што ў ліку суммы ў 965 руб. 64 кап., атрыманай ад памешчыцы Ганны Шуміловічавай, «оказалась одна двадцатипятирублевая ассигнация под № 4068418 сомнительная, которая и препровождена того ж числа для освидетельствования в правление государственного ассигнационного банка <...> а на минувшего ноября 23 дня уведомлено, что она фальшивая и из числа почитающихся выпущенными от французского правительства» [4, арк. 1].

Аналагічнае паведамленне канцылярыя віцебскага губернатара атрымлівае 16 сакавіка 1814 года, калі ў дзяржаўны заёмны банк ад памешчыцы Анэты Варыжынай паступіла «сомнительная пятидесятирублевая ассигнация под № 607891 <...> из числа почитающихся выпущенными от французского правительства» [5, арк. 1].

Падробныя расійскія асігнацыі французскай вытворчасці былі выяўлены ў 1814 годзе і сярод сум, выплачаных у Заемны банк себежскім камергерам Яўзебіям Корсакам (шэсць 100 руб. асігнацый) [6, арк. 1]; майорам баронам Фёдарам Іскулем (100 руб. асігнацыя) [7, арк. 1]; памешчыкам Ігнаціям Шышкай (100 руб. асігнацыя) і генерал-лейтэнантам князям Рамаданаўскім-Ладыжэнскім (100 руб. асігнацыя) [9, арк. 1, 8].

У падобных сітуацыях дзейнічаў наступны алгарытм — асігнацыі, якія выклікалі сумненне ў іх сапраўднасці, накіроўваліся на экспертызу ў праўленне дзяржаўнага асігнацыйнага банка, «яко единственное место могущее удовлетворять о их достоинстве» [3, арк. 1]. Пры вялікай колькасці французскіх фальсіфікатаў, запушчаных у абарачэнне, улады, каб пазбегнуць агульнага байкатавання папяровых грошай з боку насельніцтва, вымушаны былі дазволіць абмен падробак на сапраўдныя асігнацыі [2, арк. 60; 1, арк. 206].

Справа «Об обнаружении у писаря люцинского городничего Щеглова фальшивых ассигнаций» пачынаецца рапартам люцынскага гараднічага ад 21 красавіка 1814 года віцебскаму грамадзянскаму губернатару, у якім паведамляецца, што «апреля 13 числа у <...> писца Леонтия Щеглова обнаружены две пятидесятирублевые фальшивые привратно гравированые ассигнации, <...> полученные от шляхтича Шафрановского по незнанию, что сии ассигнации были фальшивые» [8, арк. 1]. Таксама падкрэсліваецца, што ў кашальку апошняга былі бачны яшчэ дзве такія ж асігнацыі.

У сувязі з ад'ездам Шафраноўскага гараднічы пасылае за ім услед для затрымкі пісара Целяшкевіча.

У сваім справаздачным рапарце Целяшкевіч падрабязна фіксуе сваё падарожжа. У прыватнасці, ён піша, што пасля атрымання задання «тотчас отправился по тракту в город Остров <...> для нахождения отправившихся по оному шляхтича Шафрановского и Зеленина, имевших у себя фальшивые ассигнации, <...> прибыл в город Остров 15 числа пополудни <...> чинил в оном разные секретные розыски <...> узнавши в одной харчевне, что оные шляхтичи с <...> какими-то крестьянами прошли город Остров пред моим приездом за два дни и пошли прямо новопроложенною дорогою в Порхов» [8, арк. 3].

Целяшкевіч на ўласныя грошы адпраўляецца ў г. Порхаў, дзе падае адпаведны рапарт мясцоваму гараднічаму. Даведаўшыся, што некаторыя вандроўнікі «проходят ближайшим трактом мимо Порхова прямо на станцию Боровичи», ён разам з прыкамандзіраваным да яго салдатам накіроўваецца ў «харчевню, <...> стоящую близ станции Боровичи», дзе збірае некалькі сялян і чакае прыбыцця Шафраноўскага і Зяленіна [8, арк. 3 адв.].

Далейшыя падзеі разгортваліся наступным чынам: пры падыходзе да харчэўні Шафраноўскі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зяленін былі «остановлены <...> обысканы <...> у Зеленина [нашли — И.К.] одно, а у Шафрановского два фальшивые <...> свидетельства, а сверх того у Шафрановского пятидесятирублевую фальшивую 1811-го года за № 3288193 ассигнацию, <...> Шафрановский показал, <...> что з сих свидетельств два имели для прохода и жительства по всей России упомянутым Шафрановичем и Зелениным, а третье несено было Шафрановским в Новгород тамошнему мещанину Ивану Позиору <...>». Менавіта ён і даў чатыры 50-рублёвыя фальшывыя асігнацыі за афармленне яму дваранскага пасведчання, з іх дзве былі аддадзены пісцу Лявонцію Шчаглову, трэцця спалена, а чацвёртая была знойдзена ў Шафраноўскага [8, арк. 3 адв. — 4]. Арыштаваныя былі дастаўлены на допыт да порхаўскага гараднічага.

Для пошукаў Пазіёра пісар Целяшкевіч быў накіраваны да пскоўскага і наўгародскага грамадзянскіх губернатараў, дзе ён даведаўся аб тым, што той з'ехаў па справах у Санкт-Пецярбург.

У далейшым люцынскі гараднічы адпраўляе рапарт віцебскаму губернатару з просьбай аплаціць пісару Целяшкевічу выдаткі і хадайніцтва аб узнагароджванні яго чынам губернскага сакратара. Гараднічы піша, што пісьмавадзіцель Целяшкевіч «отыскал и доставил людей, имевших у себя фальшивые ассигнации и свидетельства, и тем самым подал повод к открытию самих виновных по сему делу», праявіў пры гэтым «особенную расторопность и труды» [8, арк. 14 — 14 адв., 19]. Характэрным для разглядаемага перыяду з'яўляецца справа «О розыске в гор. Динабурге и уезде дворянина Гаевского, обвиненного в изготовлении фальшивых денег», якая пачынаецца са звароту віленскага грамадзянскага губернатара да віцебскіх улад з паведамленнем аб «исследовании в новоалександровском земском суде <...> 63 десятирублевых фальшивых ассигнаций с инструментами» [10, арк. 1].

Падазроныя ў падробцы асігнацый «некие Гаевские, жительствующие несколько недель в м. Друе, <...> были там арестованы и бежали» [10, арк. 1]. Уладам г. Дынабурга і павета, дзе раней жылі Гаеўскія, было накіравана распараджэнне аб правядзенні вобыску ў іх кватэры і пошуку фальшываманетчыкаў. Праца па выяўленні злачынцаў праводзілася па ўсёй тэрыторыі Віцебскай губерні. Напрыклад, гарадзецкі гараднічы паведамляе, што «бежавшего из Сибири бывшего ротмистра Ивана Осмоловского, скрывавшегося под именем Гаевского, Геллера или Гесслера в городе не замечено» [10, арк. 6 — 6 адв.].

У звароце віленскага губернатара гаварылася таксама, што «подозревающийся в подделке фальшивых ассигнаций Бонифаций Гаевский, есть именующейся дворянином Динабургского уезда, а Викентий Гаевский, служит в тамошнем уездном суде писцом <...>» [10, арк. 13]. У справе прыводзіцца апісанне прыкмет Вікенція і Баніфацыя Гаеўскіх. Вікенцій быў «лет 20, росту более умеренного, волос темно-русых, глаз серых, лица белого продолговатого, рябоватого <...> говорил по-польски и малорусски». Баніфацый — «лет более 40, росту высокого, лица умеренного сухощавого смугловатого с веснушками, глаз чорных <...> говорит по-французски и по-немецки <...>» [10, арк. 14 — 14 адв.].

16 жніўня 1843 года ў рапарце дынабургскага гараднічага паведамляецца, што «<...> дворянин Викентий Гаевский <...> содержался в динабургском тюремном замке и напоследок отправлен во временное отделение новоалександровского земского суда, а Бонифация Гаевского по многократным розыскам в г. Динабурге не оказалось» [10, арк. 18 — 18 адв.]. 25 жніўня 1843 года віленскі грамадзянскі губернатар паведамляе ў Віцебск, што «дворянин Викентий Гаевский <...> объявил, что он <...> наименовал дядею своим Бонифация или Константина Гаевского ложно <...> ибо этот человек объявил ему, Викентию, что он и есть действительно помещик Могилевской губернии Иван Осмоловский <...> служил в российских войсках ротмистром и, квартируя в г. Киеве, остался старшим корпусным адъютантом и четыре или пять лет тому назад <...> за подделку фальшивых ассигнаций был сужден в Сибирь, откуда бежал и в настоящем 1843 году скитался по городам Риге и Динабургу; теперь же этот Иван Осмоловский проживает <...> в м. Басбанден у трактирщика Поленса, где на другом этаже занимается подделкою фальшивых двадцати пяти рублевых ассигнаций и именуется там Карлом Ивановичем Геллером, имеет паспорт и бывает часто в г. Динабурге; ему 40 лет, красив собою» [10, арк. 19 — 19 адв.]. Далей ідзе просьба прыняць меры «к захвачению помянутого Осмоловского или Геллера на случай появления его в Динабурге и вообще в губернии» [10, арк. 20]. Пасля значнай колькасці паведамленняў ад мясцовых улад аб безвыніковых пошуках злачынцаў 23 чэрвеня 1845 года з'яўляецца рапарт ад віцебскага паліцмайстра аб тым, што «<...> Иван Фомин Коршун-Осмоловский задержан и содержится в Санкт-Петербургской тюрьме и <...> на допросе показал, что он в 1842 или 1843 году под именем <...> отставного аудитора 12-го класса Павла Иванова Дембовского проживал в городе Витебске в доме учителя рисования Василия Никонова Лохова и занимался деланием фальшивых ассигнаций» [10, арк. 42 адв.] Вобыск у настаўніка Лохава па пошуку прылад для выраблення фальшывых асігнацый станоўчых вынікаў не даў. Сам Лохаў прызнаўся толькі ў тым, што «<...> упомянутый Дембовецкий <...> имел у него пребывание временное и о таковом его пребывании он, Лохов, до сведения полиции не доводил» [10, арк. 42 адв.].

Эпізадычна імя Вікенція Гаеўскага ўзгадваецца і ў «Деле <...> об обнаружении фальшивых ассигнаций», дзе ваенны начальнік дзісенскага і віцебскага паветаў Вікенція Гаеўскага сябрамі часовага аддзялення новааляксандраўскага суда [11, арк. 1].

Спроба пэўнага аналізу дзейнасці фальсіфікатараў грашовых знакаў на тэрыторыі Віцебскай губерні прадстаўлена ў «Деле о появлении в обращении фальшивых кредитных билетов в г. Динабурге и уезде

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

оным», дзе ўтрымліваецца рапарт дынабургскага павятовага іспраўніка. У гэтым дакуменце ад 26 чэрвеня 1880 года, адрасаваным віцебскаму губернатару, аўтар паведамляе, што «<...> в местности, граничащей с Курляндскою и Лифляндскою губерниями довольно часто стали появляться в обращении фальшивые кредитные билеты 25-ти и 10-ти рублевого достоинства, преимущественно в среде крестьянского и еврейского населения, причём первые из них, как показало расследование, всегда являются жертвами обмана, последние же изобличаются в заведомом сбыте фальшивой монеты и привлекаются к ответственности» [12, арк. 3].

Аўтар піша, што паліцыя доўгі час адсочвае асоб, якія папалі пад падазрэнне ў фальшэрстве, але ў большасці выпадкаў не дасягае станоўчых вынікаў. Прыводзіць ён і прыклады, калі мясцовыя ўлады «не только равнодушно относятся к <...> делу, но и парализуют действия <...> по обнаружению преступников» [12, арк. 3 адв.]. Так, «задержав еврея из гор. Якобштата с 25 руб. фальшивым кредитным билетом пристав 4 стана лично отправился с ним в гор. Якобштат с целью произвести у него обыск, и <...> обратился в местный магистрат, где после многих затруднений и значительного промежутка времени <...> была ему оказана помощь» [12, арк. 3 адв.]. У выніку гэтых запаволеных дзеянняў справа «открыть преступников осталась без успеха, причем он, пристав, по некоторым данным убедился, что лица, у которых предполагалось сделать обыск, были предупреждены как о прибытии его, пристава, так равно и цели его приезда» [12, арк. 3 адв.].

Такім чынам, прыведзеныя матэрыялы сведчаць аб знаходжанні ў абарачэнні на тэрыторыі Віцебскай губерні XIX ст. даволі разнастайнага па паходжанні і па наміналах набору папяровых фальсіфікатаў расійскіх грашовых адзінак. Вытворчасць фальсіфікатаў праводзілася непасрэдна на тэрыторыі Расійскай імперыі і за мяжой. Пэўныя партыі фальшывых папяровых грошай высокіх наміналаў выраблялiся ў Англіі і Германіі. Асобную групу фальсіфікатаў складаюць падробкі расійскіх асігнацый французскай вытворчасці часоў вайны 1812 года, якія ў значнай колькасці актыўна абарачаліся на працягу другога дзесяцігоддзя XIX стагоддзя і падлягалі афіцыйнаму абмену.

У шэрагу спраў падрабязна апісваюцца дзеянні органаў улады па пошуку і пакаранні фальшываманетчыкаў, часам можна адсачыць і саму тэхналогію вытворчасці фальсіфікатаў і апісанне адпаведных прылад для выраблення падробных манет і папяровых грошай.

Увогуле, матэрыялы фонда канцылярыі віцебскага грамадзянскага губернатара — гэта невычэрпная крыніца па самых разнастайных праблемах гісторыі края перыяду XIX стагоддзя.

*Літаратура і крыніцы:*

1. Колобова, И.Н. Фальшивые российские монеты и ассигнации в Витебской губернии первой половины XIX в. / И.Н. Колобова // XIV Всероссийская нумизматическая конференция. Санкт-Петербург, 16—21 апреля, 2007 г.: тез. докл. и сообщ. — Санкт-Петербург: Изд-во Гос. Эрмитажа, 2007. — С. 205—206.
2. Маршак, М.Б. Наполеоновские подделки русских ассигнаций / М.Б. Маршак // Экономика, политика и культура в свете нумизматики: сб. науч. тр. — Ленинград: Изд-во Гос. Эрмитажа, 1982. — С. 50—64.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі — Ф. 1430. Канцылярыя Віцебскага грамадзянскага губернатара. — Воп. 1. — Спр. 33. Дело о взыскании 200 руб. с помещика Николая Бессарабского за представление им в заемный банк фальшивой ассигнации. 6.09.1813—12.11.1813. — 6 л.
4. Там же. — Дело 46. Дело о взыскании с помещицы Шумиловичевой 25 руб. за предоставленную ею в заемный банк фальшивую ассигнацию. 1.01.1814—22.11.1814. — 8 л.
5. Там же. — Дело 50. Дело о взыскании 50 руб. с помещицы Варижиной. 15.03.1814—29.04.1814. — 5 л.
6. Там же. — Дело 51. Дело о взыскании 600 руб. с помещика Корсака. 15.03.1814—15.07.1814. — 12 л.
7. Там же. — Дело 52. Дело о взыскании денег с майора Искуля, поручика Горича и других за предоставленные в банк фальшивые ассигнации. 16.03.1814—26.02.1817. — 10 л.
8. Там жа. — Дело 54. Дело об обнаружении у писаря Люцинского городничего Щеглова фальшивых ассигнаций. 21.04.1814—5.06.1814. — 20 л.
9. Там жа. — Дело 70. Дело о взыскании 100 руб. с помещика Шишки за представленную им в Заемный банк фальшивую ассигнацию. 7.05.1814—28.05.1814. — 12 л.
10. Там же. — Дело 10154. Дело о розыске в гор. Динабурге и уезде дворянина Гаевского, обвиненного в изготовлении фальшивых денег. 30.07.1843—12.09.1845. — 57 л.
11. Там жа. — Дело 10714. Дело по отношению Виленского гражданского губернатора об обнаружении фальшивых ассигнаций. 25.11.1843—29.01.1844. — 8 л.
12. Там жа. — Дело 36620. Дело о появлении в обращении фальшивых кредитных билетов в г. Динабурге и уезде оным. 7.06.1880—29.09.1880. — 64 л.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ